# Установа адукацыі «Касцюковіцкая раенная дзяржаўная гімназія»




**Аўтар: Падабед Анастасія,
вучаніца 4 «В» класа**



# Максім Багдановіч – зорка беларускай літаратуры

*( 1891- 1917 г.г.)*

**Даўно ўжо целам я хварэю,**
**І хвор душой,-**
**І толькі на цябе надзея,**
**Край родны мой!**
**У родным краі ёсць крыніца**
**Жывой вады.**
**Там толькі я змагу пазбыцца**
**Сваёй нуды.**

*М.Багдановіч*

**Нарадзіўся Максім Багдановіч**
**9 снежня 1891 года ў Мінску ў сям'і настаўнікаў. На той момант у іх быў старэйшы сын Вадзім.**



*Дом Максіма Багдановіча ў Мінску*

## Бацька



***Адам Ягоравіч Багдановіч***

***(1862-1940)***

*Педагог па адукацыі, усё жыццё прысвяціў вывучэнню культуры і быту народа, вуснай народнай творчасці*

## Маці



***Марыя Апанасаўна Мякота***

***(1869-1896)***

*Працавала настаўніцай, вельмі любіла літаратуру і нават сама спрабавала пісаць апавяданні.*

## У 1892 годзе сям'я пераехала ў Гродна

## Тут нарадзіўся брат Леў і сястра Ніна



*Дом – музей ў Гродна*

Рос Максім у сям'і, дзе шмат увагі надавалася выхаванню дзяцей. Таму не дзіўна, што ў Максіма вельмі рана абудзілася цікавасць да чытання кніг, праявіліся яго творчыя здольнасці.

Ужо ў дзесяць гадоў ён стаў пісаць вершы.

Гады вучобы з'явіліся важным этапам у духоўным і творчым развіцці беларускага паэта. Гэта былі гады настойлівай працы над сабой, паглыблення ведаў. Усе сілы, вольны час ён аддаваў літаратуры.

Паэт самастойна вывучыў некалькі замежных моў, каб ё у арыгінале чытаць творы славянскіх і заходнееўрапейскіх пісьменнікаў.



**1907 г. лічыцца пачаткам літаратурнай дзейнасці Максіма Багдановіча. Яго першым значным мастацкім творам было беларускамоўнае празаічнае апавяданне "Музыка", якое адразу ж надрукавала "Наша ніва".**

Максім Багдановіч захапляўся беларускай вуснай народнай творчасцю. І сваё апавяданне "Музыка" ён відавочна напісаў пад уплывам народнай казкі "Музыка-чарадзей". Тэма гэтых твораў падобная, творы яднаюць тое, што галоўныя героі – смелыя, справядлівыя, чулыя і спагадлівыя, заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу. Яны ўздзейнічаюць сваім граннем на людскія сэрцы: будзяць народ ад сну, клічуць змагацца за сваё шчасце. Сваёй, музыкай героі выражаюць пачуцці і думкі ўсяго народа. Так што можна сцвярджаць, што апавяданне напісана пад уплывам фальклорнага твора і адпавядае духу народнай творчасці. Але Багдановіч пераапрацоўвае і пераасэнсоўвае твор, у ім праяўляюцца аўтарскія адносіны да сваіх герояў, перагледжаны і фінал казкі.

**Багдановічы з 1908 года жылі ў Яраслаўлі, тут Максім працягваў навучанне ў гімназіі.**

**Тут ен напісаў першыя лірычныя вершы : «Над магілай», «Прыйдзе вясна», «На чужбіне», « Край мой родны!», якія былі надрукаваны у «Нашай ніве»**



***Дом – музей ў Яраслаўлі***

# *Музей братоў Луцкевічаў у Вільні*

*Верш " Слуцкія ткачыхі" 1911год*






**Пачатак 1914 года**

**Вільня**

**Першы зборнік вершаў Максіма Багдановіча “ Вянок”( 1913г. на тытульнай старонцы зборніка)**

***У зборніку каля 100 вершаў, якія аб'яднаны па цыклах:***

***"У зачарованым царстве", "Згукі Бацькаўшчыны", "Старая Беларусь", "Места"; "Думы", "Вольныя думы", "Старая спадчына", "Мадонны".***



**У 1909 годзе Максім Багдановіч захварэў на туберкулёз. (***У 1908 годзе ад туберкулёзу лёгкіх памёр старэйшы брат Максіма - Вадзім. )*

**У 1917 годзе цяжка хворы Максім у канцы лютага вымушаны выехаць у Ялту на лячэнне.**
**Тут ен дажываў свае апошнія дні ў адзіноце і закінутасці. Бацька не мог да яго прыехаць.**
**Максім Багдановіч паміраў гэтак жа высакародна і мужна, як жыў – без нараканняў і скарг. На стале ў яго застаўся неадпраўлены ліст бацьку. Максім не адправіў гэты ліст, каб не прычыняць родным лішняга клопату.**



**25 мая 1917 года**

**У дваццаціпяцігадовым узросце Максім Багдановіч памёр ад туберкулёзу.**
**Пахаваны ў Ялце .**

Максім Багдановіч – трэцяя пасля Янкі Купалы і Якуба Коласа зорка на небасхіле беларускай дарэвалюцыйнай паэзіі. Ён памёр зусім малады, на дваццаць шостым годзе свайго жыцця, не паспеўшы сказаць пра многае, што яго хвалявала. Але за свой кароткі век паэт зрабіў так многа для развіцця і ўзбагачэння роднай літаратуры, што спадчына яго стала каштоўным набыткам духоўнай культуры беларускага народа.

Вялікі грамадзянін і патрыёт, ён усё сваё кароткае жыццё аддаў служэнню свайму народу. Чалавек шырокай адукацыі, энцыклапедыст у самым поўным сэнсе гэтага слова, Максім Багдановіч ад самых пачаткаў сваёй творчасці быў у абсягу передавых агульначалавечых ідэй, у якіх ён знаходзіў месца беларускай нацыянальнай думцы.

# Помнікі Максіму Багдановічу




Яраслаўль



Мінск



Ялта